# Песняры зямлі Касцюковіцкай

УА “Гродненскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт”
***Валодчанка А.В., 1 к., 1гр., ЛФ***
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук
Навуковы кіраўнік – к.г.н., дацэнт, загадчык кафедры *Сіткевіч С.А.*

Любоў да Радзімы – гэта не абстрактнае, а рэальнае пачуццё, якое кожны чалавек можа выказаць у штодзённым жыцці шчырымі словамі, карыснымі справамі, светлымі думкамі. Свой родны куточак мы любім як часцінку нашай Бацькаўшчыны. А кожная часцінка – своеасаблівы духоўны скарб. Кожны чалавек павінен ганарыцца той мясцінай, дзе нарадзіўся і жыве: павінен мець пачуццё нацыянальнай годнасці. А гонар, у сваю чаргу, мацнее ад назапашвання ведаў пра самыя цікавыя і адметныя звесткі з гісторыі роднага куточка: якой была мясцовасць у даўнейшыя часы, адкуль паходзіць назва, якія цікавыя людзі жылі і якімі сваімі справамі, здольнасцямі запомніліся ў народзе. Узнікае неабдымная любоў да Радзімы, вялікі гонар за яе дасягненні, імкненне зрабіць свой уклад у агульную справу. Для мяне гэта – Касцюкоўшчына. Наша Касцюковіцкая маляўнічая зямля дала літаратурнаму асяроддзю шмат знакамітых паэтаў і пісьменнікаў. Гэта Іван Чыгрынаў, Васіль Хомчанка, Леанід Левановіч, Алесь Пісьмянкоў, Аркадзь Куляшоў і інш. Адзін з іх Аляксей Русецкі. Яго творы вылучаюцца сваімі інтэлектуальнымі вартасцямі, у роздуме аўтара над праблемамі навукова-тэхнічнага прагрэсу, суадносінамі прыроды і культуры заўсёды прысутнічае выразны гуманістычны пошук і клопат пра будучыню. На агульныя запыты часу ён шукаў свае адказы, пазначаныя праўдай асабіста пражытага і вынашанага, і яны, гэтыя адказы, гучаць у яго, на нашу думку, не менш пераканаўча, чым у шырокавядомых А. Куляшова, М. Танка... Ідэйна-філасофскія шуканні А. Русецкі вёў разам з мастацкімі, паэтычнымі ў галіне выяўленчых і выразных сродкаў і жанравых формаў. Творчасць – адбітак жыцця. Гэта з аднаго боку. З другога, як заўважыў яшчэ О. Уайльд, "у творчасці не можа быць таго, чаго няма ў творцы". Гаворка ідзе пра жыццёвы вопыт мастака, пра яго характар і біяграфію. Трэба адзначыць, што лёс надарыў А. Русецкага, як і ўсё яго пакаленне перадваеннай моладзі, цікавай, змястоўнай біяграфіяй. Сапраўднае яго прозвішча — Бурдзялёў Аляксей Сцяпанавіч. Нарадзіўся ён 21 лістапада 1912 г. у сяле Студзянец у беднай сялянскай сям'і. Бацька ж, вясковы грамацей, шукальнік лепшай долі. Каб забяспечыць сям'ю, ён некалькі гадоў працаваў на шахтах Данбаса. Збіраў грошы, каб выехаць у Амерыку. Прастудзіўшыся ў шахце, прыехаў дамоў і доўга хварэў. У пачатку Першай Сусветнай вайны яго забралі ў апалчэнне. У 1914 г., ён

Репозиторий ГрГМУ

быў смяротна паранены ў баі пад Варшавай, памёр у шпіталі". Аляксей застаўся з маці, а пасля таго як яна выйшла замуж у другі раз, вярнуўся да дзеда, з малых год дапамагаў яму па гаспадарцы і моцна быў звязаны з сялянскімі традыцыямі і зямлёй, хадзіў з бараной і плугам, вадзіў на начлег каня, махаў касой і малаціў цэпам. Гэта, пэўна, і вызначыла асновы светапогляду і кола жыццёвых уражанняў будучага паэта. Іх было шмат. Існаванне чалавека, яго жыццёвая экзістэнцыя багацей, чым гэта часам здаецца: не толькі буйныя, велічныя падзеі здольны ўсхваляваць яго ўяўленне, запомніцца, але і з'явы простыя, звычайныя.

Яшчэ адзін паэт, які з'яўляецца любімцам чытачоў – Леў Мінавіч Белянінаў. Ён нарадзіўся 4 студзеня 1934 у горадзе Касцюковічы. Бацька Міна Іванавіч загінуў на фронце ў Вялікую Айчынную вайну, а яго і сястру Славу гадавала і выхоўвала маці Марфа Васільеўна. Усе дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў горадзе Касцюковічы. У мае 1959 г. з групай камсамольцаў з'ехаў на цаліну ў раёны Паўночнага Казахстана, дзе працаваў камбайнерам. Тут і пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Валянцінай Фёдараўнай. У 1960 годзе па стане здароўя вымушаны быў вярнуцца ў родны край. Дзесяць гадоў працаваў выкладчыкам хіміі і біялогіі ў Белынкавіцкай СШ, быў дырэктарам Саматэвіцкай СШ імя А.А. Куляшова. Дарэчы, вучнем Льва Міновіча быў Алесь Пісьмянкоў, з якім настаўнік працягваў падтрымліваць адносіны да апошніх дзён жыцця паэта-земляка. Пасля Чарнобыльскай трагедыі з сям'ёй пераехаў у г. Касцюковічы. Акрамя ўсяго гэтага на працягу жыцця ён піша цікавыя вершы, якія друкуюцца ў раённай газеце "Голас Касцюкоўшчыны". Многія яго творы ўвайшлі ў зборнік вершаў "Крыніцы душы". Леў Мінавіч прымае актыўны ўдзел у вечарах паэзіі. У мінулым годзе ўдзельнічаў у абласным конкурсе паэтаў-настаўнікаў. У цяперашні час знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Ён заўсёды быў і застаецца шчыры ў тых справах, якім працягвае прысвячаць свой час, сваё жыццё.

Спадчына, створаная гэтымі паэтамі, – несумненна каштоўная і эстэтычна значная старонка беларускай паэзіі, якая ў наш час закранула свет чалавечай асобы і істотныя аспекты агульначалавечай інтэлектуальнай праблематыкі. У гэтым і місія паэзіі, якая нашмат пашырае нашы жыццёвыя дыяпазоны бачання і мыслення.

Спіс літаратуры:

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя / У.В. Гніламёдаў [і інш.]; пад рэд. У.В. Гніламёдава. – Мінск: Бел. навука, 2002.

2. Голас Касцюкоўшчыны. – 2012. – 29 вер. – С. 7.

3. Беларускія пісьменнікі: бібліягр. слоўнік: – Мінск: БелЭн, 1992–1995.

Рэпазіторый ГрДМУ